ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ваднку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 7 сакавіка 1930 г.
№ 55 (3563)
Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Не закранаць серадняка!

Зараз ужо больш палавіны плошчы БССР занята калгасамі. Сотні тысяч бядняцкіх і серадняцкіх двароў перайшлі да буйнай абагуленай гаспадаркі, ірвуць з прадзедаўскімі формамі гаспадаркі, становяцца актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты бурны рост калгаснага руху, гэты паварот у палітыцы партыі паступова падрыхтоўваўся ўсёй нашай папярэдняй барацьбой і работай. Бедняк і ўсьлед за ім серадняк навочна пераканаліся ў перавагах буйнае калектыўнае гаспадаркі перад дробнай, індывідуальнай і масай пайшлі ў калгас.

Генэральная лінія партыі іменна таму знайшла і знаходзіць сваё практычнае ажыцьцяўленьне, што яна адпавядала патрабаваньням жыцьця, адпавядала імкненьням мас. Партыя, вядучы за сабою масы, кіруючы імі, не адрывалася ад іх. У гэтым важнейшая прычына нашых вялізарных посьпехаў і перамог.

Тым больш рашуча трэба выступіць супроць памылак, скажэньняў, спроб адміністраваньня, ў рабоце па калектывізацыі і раскулачваньні, якія наглядаюцца ў некаторых мясцох. Тым больш рэзка трэба асудзіць «спробы палмяніць падрыхтоўчую работу па арганізацыі калгасаў чыпоўніцкім дэкрэтаваньнем калгаснага руху, папяровымі рэзалюцыямі аб росьце калгасаў, арганізацыяй папяровых калгасаў, якіх яшчэ няма ў сапраўдцасьці, але аб «існаваньні» якіх ёсьць куча прыгожых рэзалюцый». (Сталін)

Тав. СТАЛІН у сваім артыкуле «Головокружение от успехов» падкрэсьлівае, што «посьпехі нашай калгаснай палітыкі тлумачацца, між іншым тым, што яна, гэта палітыка, апіраецца на добраахвотнасьць калгаснага руху і ўлік рознастайнасьці ўмоў у розных раёнах СССР. Нельга насаджваць калгасы сілай. Гэта было-б недарэчна і рэакцыйна. Калгасны рух павінен апіравацца на актыўнае падтрыманьне з боку асноўных мас сялянства».

Такія памылкі мы мелі і ў радзе месц нашай рэспублікі. На агульным фоне вялікай масавай работы, праведзенай партыйнымі арганізацыямі, на фоне вялікага добраахвотнага руху за суцэльную калектывізацыю мы мелі ў радзе раёнаў адміністраваньне, спробы прымушаць беднякоў і сераднякоў уступіць у калгас. Замест адпаведнай падрыхтоўчай работы, замест растлумачэньня сутнасьці калектывізацыі, замест упартай барацьбы за ўмацаваньне бядняцка-батрацкіх арганізацый, замест мабілізацыі мас супроць кулака, — замест гэтага — паасобныя працаўнікі пашлі па шляху найменшага супраціўленьня, па шляху голага адміністраваньня, па шляху грубога скажэньня асноўных дырэктыў партыі.

Мы маем шмат выпадкаў прымірэнцкіх адносін да кулака, нежаданьня або неразуменьня неабходнасьці мабілізацыі бядняцка-серадняцкіх мас на раскулачваньне кулака ў раёнах суцэльнай калектывізацыі. А побач з гэтым, у нашай прэсе можна знайсьці паведамленьні аб фактах адрыву раскулачваньня ад калектывізацыі, простай дзяльбы кулацкіх сродкаў вытворчасьці замест перадачы іх калгасам. Правааппартуністычная практыка ў адносінах да кулака часта ідзе побач з перагібамі, закранаючымі серадняка. І тое, і другое — на руку кулаку, і тое, і другое вьяўляецца адлюстраваньнем націсканьня кулацкай стыхіі. Кулак проста зацікаўлены ў падрыве нашага саюзу з серадняком, кулак усімі сіламі прабуе перацягнуць серадняка на свой бок.

У сёньнішнім нумары «Зьвязды» чытач знойдзе некалькі такіх фактаў. На Мазыршчыне, у Лельчыцкім раёне, напрыклад, раскулачваньне рабілі адміністрацыйным шляхам. Бядняцка-серадняцкія масы на былі прыцягнуты да гэтай справы. Ва ўсёй рабоце па раскулачваньні фігуруюць сельсавет, ячэйка, РВК, але няма масы, няма беднякоў і сераднякоў. І ў выніку — кулацкія сродкі вытворчасьці былі пераданы не калгасам, а разьмеркаваны паміж асобнымі бядняцкімі гаспадаркамі.

У Азарнцкім сельсавеце, Тураўскага раёну, тае-ж акругі, з 32 раскулачаных гаспадарак кулацкімі аказаліся толькі 12, рэшта-ж—серадняцкія гаспадаркі.

У Новатулінскім сельсавеце, Аршанскае акругі, ніякай растлумачальнай работы на было праведзена. Бедняком і серадняком нічога не расказалі аб сутнасьці калектывізацыі, аб тым, як будуць арганізаваны прапа і вытворчасьць у калгасах. Замест усяго гэтага сельсаветчыкі пачалі запалохваць сялян, пагражалі нежаданым уступіць у калгас. «Хто за савецкую ўладу» — так было пастаўлена на галасаваньне пытаньне аб арганізацыі калектыву.

Ясна, што такая «работа» прыносіць вялізную шкоду калектывізацыі. Ясна, што пастановы аб арганізацыі калгасаў, толькі папяровымі. Ясна, што клясавы ухваленьні ў такіх умовах, зьяўляюцца ворагам пастараецца (і стараецца) скарыстаць гэтыя перагібы для дыскрэдытацыі ў вачох асноўных мас сялянства ідэі калгаснага руху.

Партыя вяла і будзе весьці самую рашучую, бязьлітасную барацьбу з недавацэнкай значэньня саюзу з серадняком, з антысерадняцкім ухілам. Партыя бязьлітасна будзе выкрываць і караць работнікаў, якія льлюць ваду на млын клясавага ворага. Партыя будзе жорстка біць на праваапартуністычнай практыцы, па прымірэнцкіх адносінах да кулака, па антысерадняцкіх загібах, якія закранаюць асновы асноў партыйнай палітыкі на вёсцы — саюз з серадняком.

Побач з гэтымі «недагібамі» і «перагібамі» мы мелі і другія памылкі, на першы погляд іншага характару, але сапраўды таго-ж парадку. Гэта непамернае забіваньне [illegible] у пытаньнях аграмаджаньня.

Асноўнае зьвяно калгаснага руху ў цяперашні час — с.-г. арцель. У ёй аграмаджваецца зямлякарыстаньне, праца рабочая і таварна-прадукцыйная жывёла, інвэнтар, гаспадарчыя пабудовы. Тав. Сталін паказвае, што арцель «найбольш мэтазгодная форма вырашэньня абожжавай праблемы. Збожжавая-ж праблема зьяўляецца асноўным зьвяном у сыстэме ўсяе сельскае гаспадаркі таму, што без яе вырашэньня немагчыма вырашыць ні праблему жывёлагадоўлі, ні праблему тэхнічных і спэцыяльных культур, якія даюць асноўны сырэц для прамысловасьці».

На гледзячы на ўсё гэта, ва многіх мясцох забываюць аб гэтым «асноўным зьвяне», прабуюць пераскочыць праз яго. Не замацоўваючы арцелі, не абагульваючы ў ёй асноўнага, неабходнага, не арганізуючы працы і вытворчасьці, упадаюць у крайнасьць, адразу-ж пераходзяць да вышэйшых форм калгаснага руху. У выніку, часамі нараджаюцца папяровыя камуны замест сапраўдных арцеляй. І сапраўды, якую-ж карысьць можа прынесьці абагуленьне дробнае жывёлы, калі не абагулена па-сапраўднаму рабочая жывёла. Такое зьмешваньне, або, як т. Сталін кажа, «звальваньне ў адну кучу» розных форм калгаснага руху, толькі на карысьць клясаваму ворагу, які бярэ стаўку на развал нашых калгасаў.

Выразным прыкладам вялізарнае шкоды, якую прыносіць справе калектывізацыі такое перакоканьне праз арцель, такія перагіпаньні ў абагуленьні жывёлы, можа служыць практыка Лёзьнянскага раёну (Віцебшчына). Тут мясцовыя работнікі ўсе свае сілы накіравалі не на абагуленьне сродкаў вытворчасьці і пятавай сілы, а на абагуленьне кароў. Абагуленьне коняй адсунута на задні плян. Калі на 20-га лютага абагулена 25 проц. кароў, дык коняй толькі — 16 проц. Пытаньні арганізацыі вытворчасьці ў калгасах, яшчэ ня сталі на парадак дня работы калгасаў гэтага раёну. Коні стаяць у хлявох сваіх ранейшых уласьнікаў, машына-конныя станцыі не арганізуюцца. І гэта ў перыяд падрыхтоўкі да палявых работ, у час, калі да сяўбы засталіся лічаныя тыдні!

Прыкладны статут с.-г. арцелі, ухвалены Калгасцэнтрам СССР, дае ясны і вычарпальны адказ, што трэба абагульняць, як трэба абагульняць. Гэты статут павінен быць дакладна вывучаны нашымі работнікамі, шырока папулярызаваны сярод сялянства і пяўхільна праводзіцца ў жыцьцё.

«Карэнны паварот вёскі да сацыялізму можна лічыць ужо забясьпечаным»— падкрэсьлівае ў сваім артыкуле т. Сталін. Мы на ўздыме, мы жывем ва ўмовах вялікай будоўлі, вялікага руху наперад па шляху да сацыялізму. Гэтага ня бачаць, не разумеюць правыя апартуністы. Невычарпальныя запасы энэргіі, актыўнасьці, што ёсьць у рабочай клясе, правільнае і цьвёрдае ленінскае кіраўніцтва партыі — парука ўмацаваньня дасягнутых перамог і прасоўваньня наперад.

Партыя няўхільна будзе працягваць барацьбу з правым ухілам і з «левымі» наскокамі, няўхільна будзе выкрываць дапушчаныя памылкі, перагібы, скажэньні. Партыя ніколі не забывала і не забудзе, што «ўменьне кіраваць ёсьць сур'ёзная справа. Нельга адставаць ад руху, бо адстаць — значыць адарвацца ад мас. Але нельга забягаць наперад, бо забегчы наперад—значыць згубіць сувязь з масамі. Хто хоча кіраваць рухам і захаваць сувязі з мільённымі масамі, той павінен весьці барацьбу на два франты—і супроць тых, хто адстае, і супроць тых, хто забягае наперад» (Сталін).

РАДЫЁ у гадзіну ночы

Бурныя дэманстрацыі па ўсёй Чэха-Славакіі

ПРАГА, 4. Сёньня праскі камітэт дзеі нічаньня разам з камітэтамі беспрацоўных апублікаваў адозву да працоўных, у якой заклікае іх дэманстраваць 6-га сакавіка пад лёзунгамі: «Хлеб—галодным», «Праца—беспрацоўным» «Улада —працоўным».

АДОЗВА ЦК КАМПАРТЫЙ НЯМЕЧЧЫНЫ, ФРАНЦЫІ І АНГЛІІ

БЭРЛІН, 5. Цэнтральныя камітэты камуністычных партый Нямеччыны, Францыі і Англіі апублікавалі супольную адозву, прысьвечаную міжнароднаму дню барацьбы з беспрацоўем—6-га сакавіка.

Кампартыі Нямеччыны, Францыі і Англіі заклікаюць усіх фабрычных і заводзкіх рабочых, а таксама беспрацоўных сваіх краёў рашуча выступіць 6-га сакавіка адзіным фронтам пад лёзунгамі: «Прэч плян Юнга», «За 7-гадзінны рабочы дзень пры поўным заработку», «За выдачу дапамогі беспрацоўным у разьмеры поўнае заработнае платы», «За супольную барацьбу працуючых і беспрацоўных супроць капіталістычнае рацыяналізацыі, фашызму і сацыял-фашызму, імпэрыялістычнае вайны, за абарону СССР і дыктатуру пралетарыяту».

ЗАБАРОНА РАБОЧЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 5. Як паведамляе агэнцтва ГАВАС, Тардзье выдаў загад аб забароне дэманстрацый 6-га сакавіка на вуліцах і каля фабрык.

Уся венская паліцыя на нагах

ВЕНА, 6. Сёньня з самай раніцы ўся венская паліцыя на нагах. З 7 гадзін усе дарогі ў Вену адрэзаны умоцненымі кардонамі жандармэрыі. Паліцыя хоча дабіцца таго, каб беспрацоўныя з прамысловых пунктаў каля Вены ня мелі магчымасьці прыняць удзел у галодным паходзе на Вену. Жандары на вуліцах Вены разганяюць усякае «зграмаджаньне народу». Рынг (натальнае месца ў Вене), да якога павінна праісьці дэманстрацыя, занят суцэльнымі шпалерамі паліцыі. Ва ўсіх гарадавых установах разьмешчаны атрады паліцэйскіх.

Уперад, да буйнога сацыялістычнага земляробства!

Да ўсіх батракоў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства БССР

1-я Усебеларуская канфэрэнцыя батрацка-бядняцкіх груп сабралася ў гістарычны момант дасягнутых вялікіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Леніна з посьпехам ажыцьцяўляецца 5-цігадовы плян вялікіх работ: пабудаваны і будуюцца моцныя гіганты прамысловасьці—фабрыкі, заводы, электрастанцыі, шпаркім тэмпам разьвіваецца сацыялістычная прамысловасьць, якая забясьпечвае хуткі тэмп перабудовы дробнае сельскае гаспадаркі ў буйную калектыўную. Нашы фабрыкі і заводы ўсё больш і больш павялічваюць вытворчасьць для сельскай гаспадаркі трактараў і сельска-гаспадарчых машын, што ўзьнімае на значную вышыню тэхніку сельскай гаспадаркі і забясьпечвае яе разьвіцьцё ў буйную сацыялістычную.

Толькі на аснове індустрыялізацыі савецкай краіны і вялікага творчага энтузіязму рабочае клясы, на аснове бліскучых перамог па выкананьні з перавышэньнем першага году 5-цігодкі, стала магчымым паскарэньне тэмпаў калектывізацыі вёскі.

Пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе авангарду—камуністычнае партыі бядняцка-серадняцкае сялянства ператварае дробна-буржазную вёску ў вёску сацыялістычную. Сотні тысяч сялянскіх гаспадарак пачынаюць будаваць новае калектыўнае жыцьцё і цьвёрда сталі на шлях перабудовы адсталай дробнай сельскай гаспадаркі ў буйную сацыялістычную. Калектывізацыя вёскі перагнала ўсе плянавыя меркаваньні і зараз ахапляе ўжо большую палову бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі. На сёньнішні дзень ужо 55 проц. зямельнай плошчы БССР пад калгасамі.

Таварышы! Шпаркае разьвіцьцё калектывізацыі сельскае гаспадаркі вырывае глебу з-пад капіталістычных элемэнтаў. Мы паставілі сваёй неадкладнай задачай — канчатковае выкарчоўваньне капіталістычных элемэнтаў. Вось чому абвастраецца клясавая барацьба. Кулак шапёна супраціўляецца калектывізацыі, бо ён ведае, што калектывізацыя азначае яго канчатковую пагібель.

На падставе буйных посьпехаў у разьвіцьці прамысловасьці і масавага абгрунтаваньня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы, мы стварылі ўмовы для поўнай замены вытворчасьці кулацкіх гаспадарак вытворчасьцю саўгасаў і калгасаў. Вось чому зусім правільным зьяўляецца паварот у палітыцы партыі да абмежаваньня і выціскаваньня кулака на палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Ажыцьцяўленьне палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, якое праводзіцца бядняцка-серадняцкімі масамі, выкананае яшчэ большае супраціўленьне кулацтва, якое ўсімі спробамі імкнецца перашкодзіць калгаснаму будаўніцтву. Кулак агітуе за разбазаваньне жывёлы і маемасьці ўступаючых у калгасы, агітуе супроць абагуленьня сродкаў вытворчасьці і г. д., бо ён ведае, што ня могуць быць моцнымі калгасы без дастатковай колькасьці вытворчасьці, ён распаўсюджвае агідную хлусьню пра калгасы, каб запалохаць адсталую масу сялян, асабліва сялянак, ён змагаецца з калгасным будаўніцтвам шляхам падпалаў, забойстваў лепшых актывістаў і арганізатараў калгасаў, ён імкнецца праслезьці ў калгасы, каб разбурыць іх з сярэдзіны. Кулак, зьяўляючыся заклятым і хітрым ворагам працоўных, у сваёй агідной рабоце скарыстоўвае асобных менш клясава-сьвядомых беднякоў і сераднякоў, асабліва жанчын, для агітацыі і барацьбы супроць калгасаў.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЗАКЛІКАЕ ЎСЁ БАТРАЦТВА І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ ВЁСКІ ДАВАЦЬ ЯШЧЭ БОЛЬШЫ І РАШУЧЫ АДПОР УСЯЛЯКІМ ЯК АДКРЫТЫМ, ТАК І ЗАМАСКАВАНЫМ СПРОБАМ КУЛАЦТВА ПЕРАШКАДЖАЦЬ КАЛГАСНАМУ БУДАЎНІЦТВУ І ПАСВАРЫЦЬ БЕДНЯКА З СЕРАДНЯКОМ.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЎПЭЎНЕНА, ШТО ЎСЕ БАТРАКІ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ БУДУЦЬ ЦЬВЁРДА ІСЬЦІ Ў САЮЗЕ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЯЕ АВАНГАРДУ —КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ, ПА ШЛЯХУ, АДЗНАЧАНЫМ ЛЕНІНЫМ.

Канфэрэнцыя заклікае ўсіх батракоў, беднякоў і сераднякоў шчыльней згуртавацца вакол камуністычнае партыі, каб пад яе кіраўніцтвам, у цесным саюзе з рабочай клясай, шпаркімі тэмпамі, правесьці суцэльную калектывізацыю савецкай краіны і ліквідаваць кулацтва, як клясу.

Масавая калектывізацыя, і на гэтай аснове ліквідацыя кулацтва, як клясы, патрабуе вялікай арганізаванасьці батрацка-бядняцкіх мас і яшчэ большага замацаваньня саюзу бедняка з серадняком.

Зараз, калі перад саветамі, як органамі пралетарскай дыктатуры, стаяць адказьнейшыя задачы, стаяць на чале калгаснага будаўніцтва, на чале барацьбы за ліквідацыю кулацтва, як клясы, як ніколі неабходна забясьпечаньне выразнай клясавай лініі ў рабоце саветаў і ўмацненьне работы груп беднаты ў саветах. Канфэрэнцыя заклікае беднякоў і батракоў да ўмацненьня працы груп беднаты ў саветах, да разгортваньня больш актыўнага ўдзелу батрацтва і беднаты ў калгасным будаўніцтве.

Мы заклікаем бядняцка-серадняцкія масы вёскі і ўсіх калгасьнікаў да выкананьня [illegible] задач веснавой сельскагаспадарчай кампаніі, якая зьяўляецца сапраўднай большавіцкай кампаніяй і павінна забясьпечыць рашаючую перамогу калгаснаму будаўніцтву.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ БЯДНЯЦКА-БАТРАЦКІХ ГРУП ЗАКЛІКАЕ ВАС ПАВЯЛІЧЫЦЬ СВАЮ АКТЫЎНАСЬЦЬ У ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАЧ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. МЫ ЗАКЛІКАЕМ ВАС РАЗГАРНУЦЬ РАБОТУ САПРАЎДНЫМІ БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ І ПАБУДАВАЦЬ РАБОТУ ПА-НОВАМУ, ПА-САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ. Мы ведаем, што няма для індывідуальнай сельскай гаспадаркі іншых шляхоў, акрамя шляху сацыялістычнага, на які ўжо стала большая частка бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР. Памятайце, што кулак, як раскулачаны, так і нераскулачаны, прымае ўсе меры да таго, каб сарваць веснавую сяўбу, і будзе весьці ўпартую барацьбу на кожным кроку практычнай работы ў арганізацыі працы і вытворчасьці калгасаў.

Мы павінны да веснавой пасеўнай кампаніі поўнасьцю абагуліць насеньне, дабіцца таго, каб калгасныя палі поўнасьцю былі засеяны ачышчаным насеньнем, каб ніводнага кавалку зямлі не засталося не засеянымі. Мы павінны стварыць машынна-конныя станцыі, добра ведаючы, што прамысловасьць адразу ня можа забясьпечыць усіх калгасаў неабходнымі машынамі.

ПЕРАД КАЛГАСЬНІКАМІ СТАІЦЬ АДКАЗНЕЙШАЯ І БАЯВАЯ ЗАДАЧА —АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАЦУ Ў КАЛГАСАХ ТАК, КАБ ХУТЧЭЙ УЗЬНЯЦЬ ПРАДУКЦЫЯНАСЬЦЬ КАЛГАСАЎ, ПА МЯТАЙЦЕ, ШТО НАБЛІЖАЕЦЦА ВЕСНАВАЯ СЯЎБА, ШТО РЫХТАВАЦЦА ДА ЯЕ ТРЭБА ХУТЧЭЙШЫМІ ТЭМПАМІ, ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА ПРАВЕСЬЦІ ЎЛІК УСЯЕ РАБОЧАЕ СІЛЫ КАЛГАСЬНІКАЎ ДЛЯ ПАЛЯВЫХ РАБОТ, ТРЭБА ЎЖО СКЛАСЬЦІ ПРАСЬЦЕЙШЫЯ ВЫТВОРЧЫЯ ПЛЯНЫ КАЛГАСАЎ, РАЗЬМЕРКАВАЦЬ РАБОЧУЮ СІЛУ ПА ВУЧАСТКАХ ПРАЦЫ І ДАБІЦЦА ТАГО, КАБ КОЖНЫ КАЛГАСЬНІК ВЕДАЎ, ШТО, ДЗЕ І КАЛІ ЯМУ ТРЭБА РАБІЦЬ.

Бярэце прыклад з рабочае клясы, якая шляхам сацыялістычнага спаборніцтва, арганізацыі ўдарных брыгад і вытворчых нарад стварыла новыя сацыялістычныя формы работы, што далі вялікія посьпехі ў ажыцьцяўленьні прамысловасьцю першага году пяцігодкі.

Мы з гэтымі вялізарнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва справімся тады, калі зь іх будуць змагацца шырокія масы калгасьнікаў, батракоў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

Арганізуйце ўдарныя брыгады, разгортвайце сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае выкананьне працы, на лепшы догляд калгаснай жывёлы, на поўнае аграмаджаньне сродкаў вытворчасьці ў калгасах. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна ахапіць ўсе масы калгасьнікаў і спрыяць найбольшаму ўзмацненьню калгасаў. НАШ ЛЁЗУНГ: «НІВОДНАГА КАЛГАСУ БЯЗ УДАРНЫХ БРЫГАД, БЕЗ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

Сусьветная буржуазія ў саюзе з сацыял-здраднікамі, бачачы ў нашым сацыялістычным будаўніцтве лазу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, рыхтуе новы ўзброены напад на СССР. Перад пасьпяховым выкананьнем у СССР пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва і ўсё ўзрастаючай хваляй рэвалюцыйнага руху рабочае клясы буржуазія ўсё больш і больш адчувае пачатак свайго канца. І таму яна шалёна ўзброіваецца, скарыстоўвае ўсё магчымасьці, пачынаючы ад розных хлусьліўых чутак аб СССР і канчаючы падрыхтоўкай белагвардзейскіх банд. Усё гэта робіцца для таго, каб сарваць нашае мірнае сацыялістычнае будаўніцтва.

Таварышы! Шпаркі тэмп індустрыялізацыі савецкай краіны яшчэ больш узмацняе саюз рабочае клясы з бядняцка-серадняцкім сялянствам, аб якім ня раз разьбіваліся намаганьні белагвардзейскіх армій памешчыкаў, паноў і капіталістых. Падрыхтоўка нападу на СССР прымушае на[illegible] напагатавае. Будзем узмацняць [illegible] ўмацняючую Чырвоную [illegible] ня, якая стаіць на варце сацы[illegible] будаўніцтва. Мы заклікаем вас бо[illegible] удзельнікі вялізарнізацыі, трымаць цесны [illegible] з Чырвонай арміяй, якая зьяўляе[illegible] вартавым межаў СССР і актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва.

Усебеларуская канфэрэнцыя батрацка-бядняцкіх груп абгаварыла рад пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва і ўзяла на сябе абавязан, разьбехаўшыся на месцы, прыкласьці значна больш энэргіі і сіл па будаўніцтву [illegible]. КАНФЭРЭНЦЫЯ ЗАКЛІКАЕ ВАС ЯШЧЭ З БОЛЬШАЙ ЭНЭРГІЯЙ І ЭНТУЗІЯЗМАМ НЕАСЛАБНА БУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ГАСПАДАРКІ. ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО НАШАЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА ЁСЬЦЬ НЕПАДЗЕЛЬНАЯ ЧАСТКА СУСЬВЕТНАЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ БАРАЦЬБЫ, ШТО, БУДУЮЧЫ МОЦНУЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ГАСПАДАРКУ, МЫ НАБЛІЖАЕМ ЧАС СУСЬВЕТНАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І ЎЗМАЦНЯЕМ АДЗІНУЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СЬВЕТУ—СССР.

Няхай жыве Камуністычная партыя — арганізатар і правадыр пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва!

Уперад да буйнога сацыялістычнага зямляробства!

Уперад да камунізму!

1-я ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ ГРУП.

На сходзе інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў

Далоў „нэйтральнасьць" і „апалітычнасьць"

УСЕ СІЛЫ І ВЕДЫ ІНЖЫНЭРАЎ І ТЭХНІКАЎ—НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ

Учора ўвечары ў Доме Культуры [illegible] быўся агульна-гарадзкі сход інжынэрна-тэхнічных работнікаў. У сваім дакладзе т. ГАЛАДЗЕД падкрэсьліў, што асноўная маса спэцыялістых працуе адданa на карысьць рабочае клясы. Але ўсё-ж асобныя групы спэцыялістых вядуць контр-рэвалюцыйную і шкоднідкую работу. Тав. Галадзед прывёў рад фактаў шкоднідства ў нас, у Беларусі, якое на працягу шэрагу год падрывала асноўныя галіны гаспадаркі — капітальнае будаўніцтва, сельскую і лясную гаспадарку і інш. Вытрымкі з паказаньняў саміх шкоднікаў, якія прыводзіў у сваім дакладзе т. Галадзед, сьведчаць аб тым, што ў Беларусі арудавалі контр-рэвалюцыйныя арганізацыі, зьвязаныя з іншымі шкоднідкімі цэнтрамі.

Гаворачы аб дыфэрэнцыяцыі інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, дакладчык застанаўліваецца на групе так званых «нэйтральных». Ён кажа:

— Няма «нэйтральных», лёяльных». Практыка паказвае, што пад шыльдай «нэйтральнасьці» часта хаваецца самы «прожженный» палітык, ворат савецкай улады і рабочай клясы.

— У эпоху рэканструкцыі народнае гаспадаркі, буйнога тэмпу будаўніцтва сацыялізму, калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, — кожны інжынэрна-тэхнічны і [illegible] працаўнік павінен зьяўляцьць [illegible] да рабочае клясы, павінен вы[illegible] сваё месца ў той гіганцкай рабоце, якую мы зараз праводзім.

Тав. Галадзед заклікае ўсіх інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў прыняць актыўны ўдзел у будаўніцтве сацыялізму, узмацніць [illegible] выкананьня пяцігодкі, дапамагчы выляўць усіх шкоднікаў, якія перашкаджаюць нам рухацца наперад—да лепшае будучыні.

Даклад т. Галадзеда вострі паставіў перад кожным інжынэрна-тэхнічным працаўніком пытаньне аб яго месцы ў пралетарскай грамадзкасьці.

Шматлікія выступленьні інжынэраў, тэхнікаў і навуковых працаўнікоў былі яскравым адказам на пытаньні, якія паставіў т. Галадзед.

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі гор. Менску [illegible] паказваюць [illegible] аддаванасьць інтарэсам рабочае клясы. Адзін за другім выступаюць спэцыялісты і зачытваюць заявы, у якіх яны просяць камуністычную партыю прыняць іх у свае рады. У ліку падпісаўшых заявы — [illegible] Бай[illegible] т.т. Капэлан, Мінкеманоўіч, Натанзон, Кіпрыянец, Бушко, Сафаразвіч, потым 16 спэцыялістых ВСНГ, 6 спэцыялістых саюзу карчаўніхоў і 5 спэцыялістых плоднае гаспадаркі.

* *

Сход вітаў рад пралетарыяткоў — ад Чырвонай арміі, камсамолу, заводу «Камунар», Бел. аддзел. «Варнітэс», пралетстуду і інш. З прывітаньнем гасьсма выступіў т. Славінскі, які заклікаў інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, на толькі выконваць свае абавязкі, але з галавой акунуцца ў барацьбу за выкананьне пяцігодкі.

Сход адчыніў старшыня ЦСПСБ тав. Рыжоў. У прэзыдыум былі абраны 57 чалавек. У гаварокы прэзыдыум — т.т. Сталін, Варашылаў, Арджанікідзе, Гей, Васілевіч і Галадзед.

Сход паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б.

Па прапанове праф. Вальфсона сход прыняў рэзалюцыю з патрабаваньнем самае жорсткае кары шкоднікам контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «СВУ» («Спілкі Вызволеньня Украіны), суд над якімі пачынаецца гэтымі днямі.

П—н.

Напружанае становішча ў краёх капіталу

Забарона сходаў і дэманстрацый у Нямеччыне, Польшчы, Францыі, Чэха-Славакіі, Аўстрыі

Буржуазія і сац.-фашыстыя рэпрэсіямі імкнуцца не дапусьціць рэвалюц. выступленьняў

Стан аблогі ў Бэрліне

16 ТЫСЯЧ ПАЛІЦЭЙСКІХ У БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ

БЭРЛІН, 6. Уся Нямеччына знаходзіцца пад уражаньнем баявых дэманстрацый, якія маюць адбыцца сёньня. У адным Бэрліне мабілізавана звыш 16.000 паліцэйскіх. Грамадзкія будынкі, муніцыпалітэт, будынак рэйхсбанку і судовых органаў ахоўваюцца моцнай паліцэйскай вартай. Ужо з раніцы будынкі муніцыпалітэту, рэйхстагу і ляндтагу былі акружаны паліцэйскім кардонам. Буйнейшыя прадпрыемствы заняты атрадамі паліцыі.

Ужо вечарам 5-га сакавіка ва многіх кварталах Бэрліна адбываліся дэманстрацыі беспрацоўных. У некаторых пунктах адбыліся жорсткія сутычкі з паліцыяй, якая арыштавала многіх дэманстрантаў. Тысячы беспрацоўных з ваколіц Бэрліна яшчэ 5-га прыбылі ў Бэрлін для ўдзелу ў дэманстрацыях.

У Мюнхэне, ня гледзячы на забарону 5-га сакавіка, адбыліся дэманстрацыі беспрацоўных. Адбыліся сутычкі з паліцыяй, якая пусьціла ў ход гумовыя палкі.

Цэргібэлі рыхтуюцца да расправы

«Ротэ Фанэ» друкуе вытрымкі з інструкцый, якія распрацаваны на нарадах паліцэй-прэзыдыуму камандным складам бэрлінскае паліцыі. Паводле інструкцый, якія распрацаваны на нарадах паліцэйскія пасты забясьпечваюцца вінтоўкамі. Паліцэйскія павінны дэталёва вывучыць правілы вулічных баёў і павінны быць гатовы да таго, што баі могуць працягвацца некалькі дзён. Паліцэйскія казармы абвешчаны на ваенным палажэньні. Паліцэйскія пасты ўжо 5-га вечарам былі забясьпечаны кулямётамі і пражэктарамі. Паліцыі загалана ліквідаваць усякія спробы сходаў і дэманстрацый. Будынак ЦК кампартыі знаходзіцца пад наглядам пераадзетых паліцэйскіх.

ЗАКЛІК КАМПАРТЫІ ШВЭЙЦАРЫІ

БЭРЛІН, 5. Як паведамляюць з Бэрна, цэнтральны камітэт кампартыі Швэйцарыі зьвярнуўся да рабочых, беспрацоўных, моладзі і жанчын з заклікам прыняць удзел у правядзеньні міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем і арганізаваць 6-га сакавіка дэманстрацыі.

ГАЛОДНЫ ПАХОД БЕСПРАЦОЎНЫХ НА ВЕНУ

ВЕНА. «Ротэ Фанэ» паведамляе, што галодны паход беспрацоўных на Вену з ваколіц і з венскага прамысловага раёну пачаўся. З поўначы і з поўдня ў Вену накіроўваюцца групы беспрацоўных. Гэтыя групы прыбудуць у сталіцу 6-га сакавіка. Большасьць удзельнікаў галоднага паходу—беспрацоўныя прамысловых цэнтраў Ніжняе Аўстрыі.

Хаваньне беспрацоўных у часе паходу па Вену абгаворваецца сталоўкамі міжнароднага рабочага камітэту.

Кампартыя арганізуе дэманстрацыі ва ўсіх буйных гарадох ПАЗШ

7 МЛН. БЕСПРАЦОЎНЫХ У АМЭРЫЦЫ

НЬЮ-ЁРК, 5. Кампартыя зьвярнулася да працоўных ПАЗШ з адозвай, у якой заклікае іх прыняць удзел у правядзеньні Міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем пад лёзунгамі: «Нэйтральнасьць — не рэвалюцыйнае выступленьне мас», «Прэч сацыял-фашыстых», «Уступайце ў рады кампартыі», «Патрабуйце працы або дапамогі беспрацоўным у разьмерах пэнсіі», «Ідзеце супроць імпэрыялістычнае вайны

М. ГАЛАДЗЕД. ПАЛІТЫКА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ВЁСЦЫ І ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

(Даклад на ўсебеларускай канфэрэнцыі батрацка-бядняцкіх груп)

Таварышы, дазвольце нашаму зьезду, як прадстаўніку бедноты і батрацтва, асноўнай нашай апоры на вёсцы, перадаць ад ураду БССР бальшавіцкае прывітаньне (воплескі).

МЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗУЕМ НАШУ КРАІНУ

Таварышы, нашы задачы сацыялістычнага будаўніцтва як усяго Савецкага Саюзу, таксама і БССР, заключаюцца ў двух важнейшых асноўных пытаньнях, першае, гэта ў тым, што нарэшце і савецкі ўрад ужо даўно абвясьцілі лёзунг аб індустрыялізацыі нашае краіны. Гэты лёзунг мы ажыцьцяўляем на ўсіх парах. Мы цяпер ужо рэальна паставілі задачу навялічэньня тэмпаў індустрыялізацыі Саюзу, у самы кароткі тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя дзяржавы ў тэхніка-эканамічных адносінах. Мы выконваем наказ нашага настаўніка і вялікага палкаводца Ў. І. Ільліча Леніна, які сказаў, што мы павінны гэта рабіць, колькі-б гэта не каштавала. Другое пытаньне, зьвязанае з першым—гэта сацыялістычная перабудова сельскае гаспадаркі на базе калектывізацыі.

Вось гэта асноўныя генэральныя пытаньні, якія вызначаюць задачы камуністычнае партыі і савецкае ўлады, гэта такія пытаньні, якія будуць вырашаць лёс узмацненьня пралетарскай дыктатуры, узмацненьня сацыялістычнай рэвалюцыі і яе далейшае развіцьцё.

Калі ўзяць першае пытаньне, індустрыялізацыю нашае краіны, то трэба адзначыць, што мы ў гэтым ужо маем значныя посьпехі. Мы змаглі абедзьвюма нагамі стаць на шлях тэхнічнае рэканструкцыі нашае прамысловасьці. Калі параўнаць з вымернікамі, якімі мы прыняли апэраваць—даваенны ўзровень нашае прамысловасьці, дык зараз мы ўжо пакінулі далёка за сабою ўзровень прамысловай вытворчасьці даваеннага часу. Мы ўжо па многіх галінах нашае прамысловасьці як цяжкой, так і лёгкай, перасягнулі больш, чым на 300 проц. супроць даваеннага ўзроўню. Мы паставілі на шырокі шлях разьвіцьця новыя віды прамысловасьці, на якіх мы залежалі ад замежных капіталістычных дзяржаў. Узяць хоць-бы такія новыя віды прамысловасьці, як трактарнае будаўніцтва. Досыць сказаць, што ў царскай Расіі на было ніводнага заводу, які-б выраблаў трактары. Зараз мы ўжо на старых заводах выраблем значную колькасьць сучасных трактараў, напрыклад, Путылаўскі завод. У сувязі са шпаркімі тэмпамі калектывізацыі мы таксама паставілі задачу пабудовы новых трактарных заводаў. Такіх заводаў мы будуем у гэтым годзе два—у Харкаве і ў Сталінградзе; наша савецкая дзяржава асыгнуе на гэта многа сотень мільёнаў рублёў, чаму можа пазайздросьціць любая капіталістычная дзяржава.

Мы станем сваёй мэтай—хутчэй скончыць пабудову гэтых заводаў.

Вось вам адзін прыклад, які гаворыць, што мы ва ўмовах савецкай улады сталі на шлях запраўднага індустрыяльнага разьвіцьця. Я ня буду падаваць многа лічбаў, якія-б характарызавалі нашы посьпехі. Досыць паказаць, што канцэнтрычныя лічбы на гэты год мы практыкавалі рост вагавой прадукцыі, які перавышае тэмпы росту і так званага адбудоўчага перыяду, напрыклад, па цяжкой індустрыі, прырост вагавое прадукцыі вызначан на 40 проц., калі ў нас ёсьць поўныя падставы гаварыць аб тым, што нашы меркаваньні да канца году будуць яшчэ і перавышаны.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРЦЫ—ВЫШЭЙШУЮ ТЭХНІЧНУЮ БАЗУ

Таварышы, калі мы гаворым аб індустрыялізацыі нашага Савецкага Саюзу, дык ні ў якім разе нельга гаварыць аб пасьпяховым разьвіцьці індустрыялізацыі, ня думаючы аб сельскай гаспадарцы. Чаму? Таму, што сельская гаспадарка зьяўляецца ў нас харчовай і сыравой базай індустрыялізацыі, [illegible] абежжавай прадукты. А [illegible] каб вытрымаць [illegible] тэмпы індустрыялізацыі, [illegible] выдаткаванцы [illegible] узмацненьня і разьвіцьця пралетарскай рэвалюцыі, мы павінны разьвіваць і другую важнейшую галіну народнае гаспадаркі—разьвіваць сельскую гаспадарку, арганізоўваць яе такім шляхам, каб забясьпечыць высокія тэмпы індустрыялізацыі палкам. У сувязі з гэтым перад намі на ўвесь рост стала задача, як арганізаваць сельскую гаспадарку, каб сельская гаспадарка не зьяўлялася тормазам індустрыялізацыі, а наадварот больш спрыяла-б высокаму тэмпу прамысловага будаўніцтва. Ці можна гэтага дабіцца і як гэтага дабіцца? Можна дабіцца і мы павінны дабіцца, каб сельская гаспадарка сапраўды зьяўлялася харчовай і сырцовай базай нашай індустрыялізацыі, але дзеля таго, каб гэтага дабіцца, мы сустрэліся з праблемай карэннай рэарганізацыі сельскае гаспадаркі. Вы ведаеце, таварышы, што мы ня можам прасоўвацца хуткімі тэмпамі на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, па шляху індустрыялізацыі без таго, каб не разьвіваць сельска-гаспадарчую вытворчасьці такога тыпу, як мы разьвіваем прамысловасьць—без узбудаваньня сельскай гаспадаркі, бо дробныя і драбнейшыя індывідуальныя сялянскія гаспадаркі з малою таварнасьцю, нізкай тэхнікай, традэдаўскімі мэтадамі апрацоўкі ня могуць угнацца за хуткімі тэмпамі індустрыялізацыі. Дзеля таго, каб сельскую гаспадарку прасунуць больш хуткімі тэмпамі на шляху узмацненьня, нам патрэбна абавязкова дастасаваць і ў сельскай гаспадарцы асноўныя прылады высокай тэхнікі.

Тэхніка і машыны вырашаюць лёс разьвіцьця тэй ці іншай галіны народнае гаспадаркі. Калі мы возьмем гісторыю разьвіцьця як прамысловасьці, так іс сельскай гаспадаркі ў любой капіталістычнай краіне, то абавязкова ўбачым, што без дастасаваньня тэхнікі, бяз ужываньня машын тэмпы разьвіцьця тэй ці іншай галіны гаспадаркі пасоўваліся вельмі слаба, дастасаваньне-ж тэхнікі адразу падымала разьвіцьцё прамысловай і сельска-гаспадарчай вытворчасьці на высокую ступень. Я вам прывяду прыклад з часоў нараджэньня прамысловасьці. Калі ў гарадох пачало наглядацца першапачатковае разьвіцьцё прамысловасьці, тады былі так званыя формы мануфактуры. Ангельшчына зьяўляецца перадавой дзяржавай, якая арганізавала мануфактурную прамысловасьць у былыя сярэдня-вяковыя часы. Ня гледзячы на ёмістасьць гэтай прамысловасьці, яе тэмп разьвіцьця быў недастаткоўны, пакуль у прамысловасьць не ўвайшлі машыны і высокая тэхніка. Калі-ж была ўведзена машына, тады тэмпы разьвіцьця прамысловасьці ва ўсіх дзяржавах найшлі надзвычай хуткімі крокамі. Возьмеце сельскую гаспадарку, там, дзе дастасоўваецца тэхніка, машыны, там узровень сельска-гаспадарчай вытворчасьці падняўся на высокую ступень.

У той час, як наша савецкая індустрыя ўжо арганізуецца і працуе на аснове высокай тэхнікі, ці можам мы з такімі мэтаднымі працы, якія ўжываюцца ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках, узмацняць сельскую гаспадарку, узмацняць эканамічны і культурны ўзровень мільёнаў бядняцкіх, батрацкіх і сераднякіх мас? Не, ня можам. Дзеля таго, каб мы сапраўды нашае сялянства выцягнулі з убоства, дзеля таго, каб мы сапраўды нашую сялянскую гаспадарку хуткімі тэмпамі пацылналі на шляху яе росту, нам патрэбна арганізаваць яе разьвіцьцё на тыпе разьвіцьця нашай буйной індустрыі. Нам патрэбна ў аснове перабудаваць нашу сельска-гаспадарчую вытворчасьць. Таму, таварышы, партыя бальшавікоў яшчэ ў часы Кастрычніцкай рэвалюцыі, а асабліва ў апошнія гады, паставіла на ўвесь свой рост задачу абагуленьня дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак, абагуленьня іх вытворчасьці ў калгасах (камунах і арцелях).

Уладзімер Ільліч Ленін яшчэ ў 18 годзе ставіў так пытаньне: дзеля таго, каб сяляне падняліся на больш высокую ступень, каб яны выйшлі з убоства і забітасьці, мы для гэтай мэты і арганізуем камуны і арцелі, але Ўладзімер Ільліч сказаў, што гэта справа новая і вельмі складаная. Дзеля таго, каб [illegible] мільённых мас бядняцка-сераднякіх гаспадарак, нам патрэбна ў бліжэйшыя часы зламаць старыя традыцыі, а якімі да гэтых часоў жыло сялянства. Трэба прапагандай і працай паказаць выгоднасьць і перавагу калгаснага земляробства перад індывідуальным земляробствам.

МЫ ПРАЦУЕМ ПАВОДЛЕ НАКАЗАЎ ІЛЬЛІЧА

Так ставіў пытаньне Ў. І. Ленін і гэтым наказам сьледзала наша партыя. Мы прыкладалі ўсе сілы і сродкі дзеля таго, каб на працягу ўсяго часу на самой справе паказаць сялянству перавагу і выгоднасьць калгасных форм земляробства. Мы ўвесь час сыстэматычна вялі прапаганду за калектывізацыю. Але, таварышы, разам з прапагандай мы выконваем і другі наказ Леніна—гэта падвядзеньне тэхнічнай і матар'яльнай базы пад калектывізацыю. Тав. Ленін гаварыў, што добры ўраджай—гэтага яшчэ мала. Дзеля таго, каб мы былі дзяржавай незалежнай ад капіталістычных дзяржаў, дзеля таго, каб мы былі дзяржавай, ідучай на шляху ўзмацненьня сацыялізму, нам патрэбна буйная машынная індустрыя, а адсюль мы павінны для прамысловасьці даваць значную субсыдыю з боку дзяржавы, і мы гэты наказ Ільліча выконваем на ўсе 100 проц. Мы за гэты год так арганізавалі нашу цяжкую індустрыю, нашу прамысловасьць, што нашы фабрыкі і заводы ўжо зьяўляюцца сапраўднай тэхнічна-матар'яльнай базай для калектывізацыі. Наша індустрыя ўжо сапраўды можа ўцягнуць сваім індустрыяльным рычагом сельскую гаспадарку на шляху сацыялістычнай яе перабудовы. Мы ўжо сёньня сельскую гаспадарку забясьпечваем, калі ня ў поўнай меры, дык прынамсі, у значнай ступені машынамі і тэхнічнай цягавай сілай.

Такім чынам, індустрыяльная і тэхнічная база, якая падведзена савецкім урадам і нашай камуністычнай партыяй пад разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, з аднаго боку, і прапаганда, якая нашай партыяй на працягу ўсіх год праводзілася словам і справай—усё гэта стварыла прадпасылку высокіх тэмпаў калектывізацыі ў сучасны пэрыяд. Калектывізацыя ахапіла сотні тысяч і мільёны дробных і драбнейшых сялян. Калгасныя формы, калгасныя буйныя гаспадаркі і ёсьць тыя формы, якія даюць магчымасьць усю сельскую гаспадарку ў больш кароткі тэрмін узьняць на больш высокую ступень і стварыць сур'ёзную сырцовую і харчовую базу для высокіх тэмпаў індустрыялізацыі нашай краіны, якія даюць магчымасьць дастасаваць высокую тэхніку і культуру ў сельскай гаспадарцы, бо сучасная гаспадарка нашых індывідуальных сялян такая, што ў ёй ніякага трактара і ніякай машыны ўжыць нельга., яна ні ў якім разе ня зможа даць высокай прадукцыйнасьці працы працоўных сялян.

Буйныя калгасы і ёсьць тая асноўная форма сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі. Узбуйненьне сельскай гаспадаркі шляхам аб'яднаньня ў калгасы мільённых мас бядняцка-сераднякага сялянства—гэта ёсьць генэральны шлях сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Бальшавікі яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі даводзілі большую ўстойлівасьць, большыя пэрспэктывы разьвіцьця буйной сельскай гаспадаркі перад дробнымі індывідуальнымі гаспадаркамі.

Уладзімер Ільліч Ленін у сваіх геніяльных працах «Разьвіцьцё капіталізму ў Расіі» і ў тэорыі аграрнага пытаньня даводзіў, што тэорыя эсэраўскіх ідэолёгаў, разьлічаная на «устойлівасьць» дробных гаспадарак,—ёсьць тэорыя дробна-буржуазная.

ДВА ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ

І ў капіталістычных дзяржавах у іх таварнай сельскай гаспадарцы дастасоўваецца высокая тэхніка і машыны, пануючай формай зьяўляецца там буйное зямляроўства: абшарніцкія маёнткі і кулацка-фэрмэрскія гаспадаркі. Возьмеце Амэрыку і ў прыватнасьці Аргентыну, якая вывозіць хлеб на сусьветны рынак. Але якім чынам дабілася Амэрыка высокай прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі? Дастасаваньнем тэхнікі і культуры, тэхніку-ж і машыны яны ўжываюць у кулацка-фэрмэрскіх гаспадарках. Але розьніца між узбуйненьнем сельскае гаспадаркі ў капіталістычных дзяржавах і між узбуйненьнем, якое ў нас праводзіцца,—вельмі вялікая. Якая-ж гэта розьніца? Узбуйненьне там ідзе, у капіталістычных краінах, на аснове вышыбаньня мільённых мас дробнага сялянства. Там арганізуюцца буйныя кулацка-капіталістычныя фэрмы, на якіх ужываюцца ўсе дасягненьні высокай тэхнікі. **Арганізацыя гэтых капіталістычных фэрм ідзе праходзіць на шляху вышыбаньня дробных і драбнейшых сялянскіх гаспадарак.** Расьце буйны абшарнік буйны фэрмэр на базе капіталістычнай, на сьпінах мільённых [illegible] бядняцка-сераднякіх мас, якія прыводзяцца да становішча вечных поўпралетараў і батракоў, працуючых на капіталістычных фэрмах.

Вось прынцып капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Мы-ж праводзім узбуйненьне сельскай гаспадаркі і яе ўздым на сацыялістычнай базе, на базе калектывізацыі. **Мы праводзім арганізацыю буйной сацыялістычнай сельскай гаспадаркі на базе матар'яльнага і культурнага ўздыму мільённых бядняцка-сераднякіх мас сялянства, шляхам аб'яднаньня іх у калгасы і вышыбаньня кулацкай часткі.** Значыцца, у нас робіцца зусім наадварот у параўнаньні з капіталістычнымі краінамі. Мы прыймаем неабходнасьць узбуйненьня і ўзмацненьня сельска-гаспадарчай вытворчасьці на базе арганізацыі калгасаў, на базе эканамічнага і культурнага росту мільённых бядняцка - сераднякіх мас сялянства, шляхам вышыбаньня невялікай кулацкай верхавінкі з сельскай гаспадаркі і яе вытворчасьці, якая, (кулацкая вытворчасьць), павінна быць заменена буйной калектыўнай сельска-гаспадарчай вытворчасьцю.

Там, у капіталістычных краёх, расьце невялікая кучка фэрмэраў і ажабрачваецца сялянства ў сваёй масе. Мы-ж ставім задачу пад'ёму эканамічнага і культурнага ўзроўню нашых працоўных мас сялянства шляхам аб'яднаньня яго ў калгасы. У гэтым розьніца ўстаноўкі сацыялістычнай ад капіталістычнай. Дробная гаспадарка ня можа ўжываць культуру і тэхніку, а без ужываньня гэтай тэхнікі недарэчна было-б думаць аб сур'ёзным разьвіцьці сельскай гаспадаркі і аб уздыме працоўных сялянскіх мас, аб падняцьці іх на больш высокую эканамічную і культурную ступень.

ВЯЛІКІ ПЕРАЛОМ

Вось, таварышы, асноўны прынцып калектывізацыі. Якія-ж мы маем практычныя вынікі калектывізацыі? Я ўжо гаварыў, што ў сувязі з тым, што ў нас пашырылася тэхнічная індустрыяльная база калектывізацыі праз пад'ём нашай прамысловасьці, а таксама ў сувязі з прапагандай бальшавіцкай партыі, якая праводзілася, калектывізацыя ўжо цалкам ахапіла мільённыя масы, асноўную тоўшчу сераднякка - бядняцкіх гаспадарак, і мы ўжо маем нябывалы зрух у бок шпаркага тэмпу калектывізацыі. Даволі сказаць, таварышы, што фактычныя лічбы калектывізацыі перавышаюць усе нашы меркаваньні. Я ўжо не гавару аб тым, што пяцігодка па калектывізацыі перавышана ў некалькі раз. Я не гавару, што нашы нядаўнія меркаваньні аб калектывізацыі БССР на працягу двух адоў, аб чым была вынесена пастанова ЦК КП(б)Б,—таксама вынераджаны і перавышаны—мы на сёньняшні дзень па Беларусі маем ужо каля 70 проц. калектывізаванай сельска-гаспадарчай пашы. Калі ўзяць колькасьць калектывізаваных гаспадарак, дык яна складае каля 60 проц. па БССР.

Аб посьпехах калектывізацыі таварыш ня толькі нашы лічбы, але гэта прызнаюць і нашы клясавыя ворагі. Даволі спасылцца на тое, што нават некаторыя больш далёкабачныя буржуазныя лідэры такама лічаць, што ў Савецкім Саюзе праходзіць нябывалы працэс карэннай перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычных начатках. Побач з цкаваньнем і хлусьнёй, якія праводзяцца за мяжой аб нашым Саюзе, мы маем з боку больш далёкабачных буржуа, больш-менш аб'ектыўную ацэнку нашага станоўішча, напрыклад: ангельская газэта «Манчэстэр-Гардыян»—газэта лібералў—эт'ой партыі, на чале якое стаіць Лёйд-Джордж, аб якім мы ўжо чулі яшчэ ў часы жыцьця Леніна, які тады імкнуўся ў Генуі спаткацца з Ўладзімерам Ільлічом Леніным, гэты самы Лёйд-Джордж і яго газэта піша аб нашых працэсах сацыяльнай калектывізацыі, якія ў нас праходзяць. Я ня буду прыводзіць усю вытрымку аб гэтым, бо аб гэтым магні ўсе ўдзельнікі выезду прачытаце ў нашых савецкіх газэтах. Але трэба сказаць, што гэта ангельская газэта піша:

«Але мы прынамсі маем справу з малюнкам які перастае быць фантастычным і становіцца праўдападобным. Мы ўпэўніваемся, што бесьперапынная прапаганда калектывізацыі сельскай гаспадарцы, якая (прапаганда) вялася на працягу 12 год, не засталася бяз вынікаў, і што ў Расіі ў сучасны момант ёсьць некаторыя раёны, у якіх індывідуальныя гаспадаркі існуюць ня як правіла, а як выключэньне. Мы упэўніваемся, што больш багатыя пласты сялянства на працягу некаторага часу [illegible] ў магчымасьць пасьпяхова [illegible] калгасы і [illegible] далучацца да іх, у іншых [illegible] выпадках падпадзалі іх.

У [illegible] сельска- гаспадарчай газэце за 28-е студзеня вы можаце, хто цікавіцца, прачытаць цалкам гэты артыкул. Я прывёў гэту вытрымку для таго, каб даказаць, што больш сьпела мысьлячыя ідэолёгі буржуазіі таксама разумеюць той вялікі працэс перабудовы сельскай гаспадаркі, які ў нас праходзіць, і, хочуць ці ня хочуць, але чыні павінны прызнаць гэты факт вялікага калгаснага руху ў нашай краіне, удзельнікамі якога мы зьяўлемся.

Тая кольчасьць калектывізаваных сельскіх гаспадарак, якая ёсьць у БССР і ва ўсім Саюзе, гаворыць аб тым, што мы знаходзімся на вялікім гістарычным пераломе. Мы знаходзімся на новым і вялікім этапе разьвіцьця нашай Кастрычніцкай рэвалюцыі, гэты гістарычны этап, круты паварот мільённых мас бядняцка-сераднякага сялянства, каранным чынам зьмяняе надставу эканамічнага і бытавога зьместу гэтых шматмільённых бядняцка-сераднякіх мас. Мы ня толькі зьяўляемся сьведкамі гэтага вялікага гістарычнага пералому, але мы зьяўлемся і актыўнымі яго ўдзельнікамі. Мы знаходзімся на шляху карэннае ломкі алсталых форм вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы. Мы карнным чынам ломім векавыя мсталыя формы і зьмянем псыхалёгр і быт бядняцка-сераднякіх мас.

ПРАМОГА ЛЕНІНІЗМУ

Гэта масавае вялікае гістарычнае значэньне. Мы знаходзімся ў такім пэрыдзе разьвіцьця сацыялістычнае рэвалюцыі, што для мноства бядняцка-сераднякіх мас нярэмкістны тыя скачкі, якія мы робім праз цэлыя этапы разьвіцьця. Даволі спасылцца на тое, што там, дзе арганізаваліся на-запраўднаму калгасы, там, дзе бядняцка-сераднякіяя масы падрыхтоўваліся да арганізацыі калгасаў, асабліва там, дзе ўжо на былых вузкіх паосах засеяны суцэльныя палі азімінь і ярыны і дзе ўраджаі ўжо зьня ты калектыўна ў мінулую восень,—мы там маем ужо зусім новае жыцьцё, зусім новы думкі з боку шматмільённых мас сялянства.

Хто ня ачыць гэтых вялікіх зрукаў у найбольш адсталай частцы нашай эканомікі—у сельскай гаспадарцы, хто ня бачыць гэтых вялікіх сацыяльных і эканамічных зрухаў сярод мільённых мас нашага працоўнага сялянства,—той зьяўляецца непапраўным апартуністам.

Аб чым гаворыць такія вялікія скачкі за апошні год у справе калектывізацыі? Яны гавораць аб тым, што тэорыя марксізму абрэвалюцыйных скачкох у разьвіцьці чыгавецтва яшчэ раз на ўсе 100 проц. пацьвердзілася і пацьвярджаецца.

Тады, дні Кастрычніка, нам дробнабуржуазныя ідэолёгі—эсэры і меншавікі—гаварылі, што нельга адразу перайсьці ад дарызму да дыктатуры пралетарыяту, да сацыялізму. Яны нам прапаведвалі эвалюцыйныя шляхі, каб мы праходзілі праз поўныя гістарычныя ступені ліхімі крокамі. Наша партыя і тады гаварыла, што калі пытаньне насьпела, дык мы можам і павінны зрабіць рэвалюцыйны скачок, што мы можам перайсьці цэлыя ступені ў больш кароткі тэрмін, калі мы устанем на шлях пралетарскае рэвалюцыі. На справе мы гэта запраўдамі, і цяпер ідэолёгі дробнай буржуазіі—сацыял-дэмакраты, меншавікі—у буржуазных дзяржавах прапавядуюць шлях развіцьця сацыялізму праз эвалюцыю рабочых з буржуазіяй, што рабочая клясы можа пібіта мірным шляхам прыйсьці ў сацыялізм.

Мы гаворым, што гэта ёсьць самы [illegible] дурман для пралетарыяту [illegible]

[illegible] што такія ідэолёгі зьяўляюцца самымі небясьпечнымі ворагамі дыктатуры пралетарыяту і рабочае клясы, што яны зьяўляюцца лепшымі служкамі буйных банкіраў буржуазіі.

Мы-ж на справе паказалі, што на падставе марксыцка-ленінскай тэорыі аб клясавай барацьбе мы можам падрыхтаваць пралетарыят і асноўныя бядняцка-сераднякіяя масы сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі да больш хуткага пераходу да сацыялізму ў больш кароткі тэрмін. І гэтым шляхам мы можам прайсьці за больш кароткі тэрмін, неабходныя падрыхтоўчыя курсы, мы іх ўжо ў асноўным прайшлі. Паглядзім на клімавіцкага селяніна, які ня так даўно яшчэ хадзіў у лапцях і зьбіраўся памерці ў лапцях, на таго селяніна, які ўчора сахой абрабляў зямлю, на таго селяніна, які сеяў бульбу і думаў, што гэта бульба вырасьце добрая толькі тады, калі ён яе пасее ў той момант, калі на небе будзе адпаведная колькасьць хмарак. На сёньняшні дзень гэты селянін ужо зьяўляецца адным з лепшых і перадавых нашых сялян. На сёньняшні дзень ён ужо ведае, што лепшы ўраджай можна атрымаць толькі тады, калі ён будзе мець добрую тэхнічную зброю, добры плуг і добрае насеньне, а таксама мінэральныя ўгнаеньні. Сёньня той селянін ужо па-новаму мысьліць, у яго ўжо ёсьць дзяржаўны падыход да работы. Ён ужо думае зусім па-новаму. Наш селянін на сёньняшні дзень ужо ведае, што ён павінен перайсьці ад сваёй індывідуальнай сельскай гаспадаркі на гаспадарку калгасную таму, што калгасная гаспадарка выгадней.

Вось гэты эканамічны пераварот, пераварот у вытворчых адносінах мільёнаў бядняцка-сераднякіх мас, пераход ад індывідуальных гаспадарак на калгасныя гаспадаркі зьяўляецца сьведкай таго, што пры адпаведных умовах мільённыя масы рабочых і сялян могуць зусім хутка (у гістарычным разрэзе) пайсьці (а яны ўжо пашлі) на шляху пасьпяховага разьвіцьця эканомікі, быту і культуры ўсяго працоўнага чалавецтва на новых сацыялістычных падставах. А якія ўмовы спрыялі гэтаму? Гэтаму пераходу ад сахі да трактара, ад лапцёў да ботаў, ад гаспадаркі індывідуальнай, уласнай да калгасаў) **спрыялі тыя ўмовы, што мы на працягу 12 год з лішкам маем у нашай дзяржаве дыктатуру пралетарыяту, маем савецкую ўладу, маем кіраўніцтва выпрабаванай бальшавіцкай партыі, маем дыктатуру пралетарыяту, як форму дзяржаўнага кіраўніцтва,** пры якой мы маем пралетарскую волю, сапраўдную пралетарскую дэмакратыю, якая дае магчымасьць праяўляць ініцыятыву шырокім масам рабочых і працоўнаму сялянству. Гэта тое, што дало магчымасьць шырокім масам рабочых і сялян прайсьці падрыхтоўчы курс у кароткі тэрмін і падрыхтавацца так, каб селянін пры дапамозе пралетарыяту, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мог перарабіць сельскую гаспадарку на сацыялістычны лад. Гэта, таварышы, зьяўляецца асноўным. Ясна адсюль, што тэорыя Маркса апраўдваецца на ўсе 100 проц.

ПАВАРОТ У ПАЛІТЫЦЫ НАШАЙ ПАРТЫІ

У сучасны момант наша партыя высунула лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі. Гэты лёзунг робіць рэзкі, новы паварот у нашай палітыцы. А чым ён выкліканы? Ён выкліканы тым, што мы ў нашай сельскай гаспадарцы [illegible] ня зусім новы, вытворчыя адносіны, [illegible] на новыя формы арганізацыі зямляроўства таму, што асноўная маса бядняцкіх і сераднякіх гаспадарак рушылася ў калгасы. Таму мы паставілі і вырашаем новыя задачы нашай палітыкі. Задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, на справе значае ўступіць на шлях арганізацыі сапраўднага бясклясавага грамадзтва, сапраўднага выкарчоўваньня па справе карэннага капіталізму ў тых галінах гаспадаркі, з якіх кожны дзень, кожную гадзіну, як казаў Ўладзімер Ільліч, вырастаў капіталізм.

МЫ БУДУЕМ БЯСКЛЯСАВУЮ ГРАМАДУ

Тав. Ленін, гаворачы аб зьнішчэньні клясаў, сказаў так:

«Каб зьнішчыць клясы, трэба, папершае, зьнішчыць розьніцу паміж рабочым і селянінам, зрабіць усіх работнікамі. Гэтага нельга зрабіць адразу. Гэта можна выраішць толькі арганізацыйнай перабудовай усяго грамадзкае гаспадаркі, пераходам ад адзіночкай абасобленай таварнай гаспадаркі да грамадзкай буйной гаспадаркі. Пакорыць гэты пераход можна толькі такой дапамогай селяніну, якая-б давала яму магчымасьць у вялізарных разьмерах паленціць усю зямляробчую тэхніку, пераварыўшы яе ў корані».

(Ленін, том XVI, ст. 352).

Так ставіў Уладз. Ільліч задачу зьнішчэньня клясаў. Трэба сказаць, што ў нас у сучасным этапе разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва сталі ўжо дзьвюма нагамі на шлях ажыцьцяўленьня такой формулы Ўладзімера Ільліча, калі мы, дзякуючы разьвіцьцю дапамогі з боку дзяржавы, далі ўжо па сутнасьці магчымасьць дробнаму селяніну перабудаваць сваю гаспадарку на новы лад, і гэта зьяўляецца пачаткам зьнішчэньня клясаў у краіне пралетарскай дыктатуры, гэта зьяўляецца пачаткам уздыму на больш высокую ступень мільённых бядняцка-сераднякіх мас сялянства. Гэта зьяўляецца тым, што бядняк і серадняк будзе сапраўдным удзельнікам будаўніцтва сацыялізму. Але, таварышы, гэта толькі пачатак, толькі першы і яшчэ невялікі крок у справе ліквідацыі клясаў. Гэта задача вельмі вялікая і надзвычай цяжкая, якая патрабуе для яе выкананьня доўгага часу ўпартай і бязьлітаснай клясавай барацьбы.

Гэта задача ліквідацыі кулацтва, як клясы, якая вынікае з суцэльнай калектывізацыі, не праходзіць і ня пройдзе без труднасьцяй. Мы не арганізуем калгасаў, седзячы на печы. У нас калгасы растуць у барацьбе з кулаком, у клясавых бойках бедноты і батрацтва пры падтрыманьні серадняка супроць кулака.

Толькі ў клясавай барацьбе могуць зьнішчыцца клясы. І ў зьвязку з гэтым, ліквідацыя кулацтва, як клясы, як выпік суцэльнай калектывізацыі, гэта вельмі складаная задача. Патрэбна максымальная клясавая выразнасьць у працы ўсіх нізавых зьвяньняў, а таксама і мільённых мас бедноты, батракоў і сераднякцтва.

ЗМАГАЦЦА СА СКАЖЭНЬНЯМІ ЛІНІІ ПАРТЫІ

Таму я-б хацеў спыніцца ў сваім дакладзе на тых мэтаках працы, якімі ў нас у некаторых выпадках праводзіцца калектывізацыя радам нашых нізавых органаў і якімі ня трэба праводзіць. Я буду гаварыць аб некаторых выпадках скрыўленьня лініі нашай партыі, напрыклад, якія маюцца у Беларусі.

Мы маем на мясцох значныя скрыўленьні нашай парт. лініі. Гэтыя скрыўленьні ідуць па 2-х напрамках. Першы—некаторыя мясцовыя працаўнікі недаацэньваюць тэй клясавай барацьбы, якая праходзіць у нас на вёсцы, і ў зьвязку з гэтай недаацэнкай мы маем апартуністычную мазьню з кулаком. Ёсьць выпадкі, калі ня толькі паасобныя беднякі і актывістыя, беспартыйныя і партыйныя працаўнікі і члены сельсаветаў не разумеюць гэтых працэсаў клясавай барацьбы, не разумеюць неабходнасьці ўзмацненьня наступленьня на кулацтва з мэтай ліквідацыі яго, як клясы, у раёнах суцэльнай калектывізацыі, таму ў такіх выпадках некаторыя супрацоўнікі у справе раскулачваньня праяўлялі 100 проц. апартунізм на практыцы. Вось я буду пацьвярджаць гэта канкрэтнымі прыкладамі. Напрыклад: член Пераратоўскага сельсавету, Цэрахаўскага раёну, член КП(б)Б, т. Зайцаў Ясь, будучы запрошаным для складаньня вопісі маемасьці кулакоў вышэйпаданага сяла, адмовіўся, заявіўшы: «Я не пайду апісваць кулацкія гаспадаркі, а пайду лепш апісваць [illegible] раў, і ніхто [illegible] ня можа распара[illegible]».

Тады ўчынак сьведчыць аб многіх прыкладах сапраўдных апартуністычных адносін да палітыкі партыі.

У Першамайскай парт'ячэйцы па намаганьні сакратара тав. Тарасэвіча быў дазволены прыём у калгас раскулачанага кулака, антысавецкі настроенага, на праверку, вярней, ячэйка хацела ўпэўніцца, як будзе працаваць кулак у калгасе.

У калгасе «Чырвоны Маяк» па намаганьні члена партыі — агранома — была прынята сям'я заможнага, арыштаванага ДПУ за антысавецкую дзейнасьць.

Гэты факт гаворыць аб чым? На якое «выпрабаваньне» вы бераце клясавага ворага? Вы пускаеце яго ў калектыўную гаспадарку, якая вырастае ў клясавай барацьбе з кулаком; кулак падпальвае гэту калгасную гаспадарку, страляе ў калгасьнікаў, а вы яго бераце ў калгас на «выпрабаваньне». Я ўжо не гавару аб тым, што ёсьць пастанова пленуму ЦК КП(б)В аб забароне прыёму кулака, але ці можна дапусьціць такую апартуністычную мазьню, каб член партыі так адносіўся да свайго клясавага ворага. Гэта недапушчальная рэч.

Я ня буду прыводзіць другіх прыкладаў аб сапраўдным апартунізьме на практыцы, а іх у мяне ёсьць шмат. Я прывёў вам толькі два, каб многія з вас упэўніліся, што распускаць сьлёзы ў жорсткай клясавай барацьбе з кулаком — гэта начыць рабіць самую няпрыглядную справу і ліць ваду на млын правых апартуністых і працаваць супроць мерапрыемстваў нашай савецкай улады і партыі.

З гэтымі зьявішчамі трэба рашуча змагацца. Вы, батрацтва і беднота, зьяўляецеся асноўнай апорай нашай партыі і савецкай улады на вёсцы. Батрак і бядняк павінен трымаць высока сьцяг выразнай клясавай палітыкі, ніякіх слабых плаксівых настроеў у адносінах да кулака быць ня можа. Калі вы іх дапускаеце ў калгас, працуючы там на месцы, вы зьяўляецеся несапраўднымі прадстаўнікамі пралетарскіх і поўпралетарскіх мас вёскі, тэй масы, якая павінна зьявіцца асноўнай клясавай апорай нашай партыі на шляху калектывізацыі.

Вы павінны весьці барацьбу з такімі апартуністычнымі праявамі. Калі мы гаворым аб карэннай ломцы старых вытворчых адносін на вёсцы, ператвараюку ў буйную калгасную, ліквідуючы кулака, як клясу, дык ніякіх сьлёз не павінна быць у адносінах да клясавага ворага. Хто гэтыя сьлёзы дапускае, той дапамагае кулаку. Калі мы гаворым аб раскулачваньні і праводзім гэтае раскулачваньне, то наша рука, рука рабочае клясы, рука батрацка-бядняцкіх мас, не павінна адрыгануцца. Ясна, што ў першую чаргу парт. арганізацыі і савецкія органы павінны весьці барацьбу з такімі членамі партыі і членамі сельсаветаў, якія, замест таго, каб быць на справе праваднікамі дыктатуры пралетарыяту, паслабляюць гэту дыктатуру, зрываюць нашу працу.

«АДМІНІСТРАВАНЬНЕ» Ў СПРАВЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ — НА-РУКУ КУЛАКУ

Заадно я хацеў сказаць і аб скрыўленьні клясавай палітыкі і ў другі бок. У бок заскокаў і адміністрацыйных перагібаў. Ёсьць і такія прыклады — гэта так званае «адміністраваньне» ў пытаньнях калектывізацыі. Нельга дапусьціць, каб нашы працаўнікі сілаю і запалохваньнем ганялі ў калгасы і парушалі прынцып добраахвотнасьці. Гэта ёсьць таксама скажэньне палітыкі нашае партыі. А я маю выпадкі з практыкі сваёй паездкі па вёсках, якія сьведчаць аб гэтым; я шмат раёнаў абезьдзіў, і з тых матар'ялаў, якія я падрабязна вывучыў на месцы, відаць, што ёсьць выпадкі, калі пасобныя т.т. агітуюць за калгас пагрозай, што «калі

ЧЫНОУНІЧАЕ ДЭКРЭТАВАНЬНЕ КАЛГАСНАГА РУХУ

Ударым па прымірэнчых адносінах да кулака, па перагібах, якія закранаюць серадняка

РАСКУЛАЧЫЛІ СЕРАДНЯКОЎ

Дрысенскія раённыя работнікі (Полаччына) скажаюць лінію партыі ў пытаньні аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. Так, напрыклад, у Цястоўскім сельсавеце абкладзены ў індывідуальным парадку 22 серадняцкія гаспадаркі, якія зараз усе і раскулачаны.

У Жоўпінскім сельсавеце індывідуальна абкладзена і раскулачана 5 сераднякоў. Ёсьць выпадкі раскулачваньня сераднякоў і па іншых сельсаветах.

Райком КП(б)Б і РВК на ўсе гэтыя непармальныя зьявішчы не рэагуюць. Так, калі пракурор 1-га вучастку тав. Янаніс хацеў выехаць на месца і зрабіць сьледзтва па гэтай справе, то сакратар райкому Пушчын забараніў яму займацца гэтай справай.

— Раскулачаньне зроблена з ведама РВК і таму ня трэба па гэтым пытаньні ўзьнімаць паніку, — так заявіў Пушчын пракурору.

Толькі пядаўна па настойлівым патрабаваньні пракурора Янаніса было склікана пасяджэньне падатковай камісіі, на якім было пастаноўлена аслабаніць з 22-х 17 серадняцкіх гаспадарак, індывідуальна абкладзеных і раскулачаных.

Такім чынам, памылка гэта выпраўлена, але-ж ніхто не рэагаваў на апартуністычныя выступленьні сакратара РК Пушчына.

Брыгадзір «Зьвязды» ХАЛЯВІН.

Раскулачваньне абярнулі ў дзяльбу

Практыка работы па раскулачваньні ў Лельчыцкім раёне на Мазыршчыне сьведчыць аб тым, што мясцовыя працаўнікі зусім не зразумелі дырэктывы партыі. У выніку ў раёне быў дапушчан рад грубых палітычных памылак і скажэньняў пры правядзеньні раскулачваньня.

Напершае, зварачае на сябе ўвагу той факт, што ва многіх вёсках раскулачваньне было праведзена бяз удзелу шырокіх мас батрацтва і беднаты. Ва ўсёй рабоце па раскулачваньні перад сялянствам фігуруе сельсавет, РВК ячэйка, але не батрацка - бядняцкія масы сялянства.

Асноўным недахопам у рабоце па раскулачваньні зьяўляецца тое, што яна ня ўвязана з калектывізацыяй.

Канфіскаваную ў кулакоў маемасьць і жывёлу перадавалі не ў калектывы, не ў абагуленыя стайні і хлявы, а разьмяркоўвалі яе па асобных бядняцкіх гаспадарках. Праўленьні калгасаў і сельсаветы сталі органамі разьмеркаваньня кулацкай маемасьці паміж паасобнымі бядняцкімі гаспадаркамі.

Раскулачваньне было пачата без папярэдняй праверкі маемаснага стану кожнай гаспадаркі. У выніку ў радзе месц былі раскулачаны сераднякі.

Так, у Тураўскім раёне ў Азяранскім сельсавеце было ападаткавана ў індывідуальным парадку 32 гаспадаркі. На запытаньне, колькі ў вас у сапраўднасьці кулакоў, працаўнікі сельсавету адказалі—толькі 12. Рэшта ападаткаваны індывідуальна па памылцы раённых працаўнікоў.

Усе гэтыя скажэньні і памылкі як у Тураўскім, так і ў Лельчыцкім раёнах былі дапушчаны з-за адсутнасьці належнага кіраўніцтва з боку раённых арганізацый. Райкомам і РВК ня былі скліканы нарады сакратароў ячэек і старшынь сельсаветаў. Практычных паказаньняў сельсаветам, старшыням калгасаў, як і што рабіць, не далі.

У выніку працаўнікі на мясцох здолелі толькі падняць рукі сялян за калектывізацыю, але не змаглі іх згуртаваць, каб правільна арганізаваць вытворчасьць і працу ў калгасах. У Лельчыцкім раёне арганізавана 40 калгасаў, але фактычна большасьць з іх існуе толькі на паперы.

Брыгадзіры «Зьвязды» **Лаўкет і Шафронак.**

Выпраўляюць памылкі

У Парыцкім раёне раскулачаньне было праведзена пры шырокім удзеле батрацтва і беднаты, а таксама сходаў калгаснікаў. Раскулачваньне знайшло вялізарнае падтрыманьне з боку батрацка - бядняцкай і серадняцкай масы вёскі. Уся маемасьць, канфіскаваная ў кулакоў, была перадана калгасам

Трэба адзначыць, што побач з гэтым пры раскулачваньні былі дапушчаны некаторыя памылкі. Напрыклад, былі раскулачаны тры серадняцкія гаспадаркі. Зараз гэтыя памылкі выпраўляюцца і гэтым серадняком будзе вернута канфіскаваная ў іх маемасьць.

АЛІМПІЕЎ.

Як т. Тарасенка скажае лінію партыі

За 40 кілёмэтраў ад гор. Воршы знаходзіцца вёскі Нова-Тухінскага сельсавету. Ніякай культурнай работы там не вядзецца. Пытаньня аб калектывізацыі да апошняга часу ніхто ня ставіў. Гэту акалічнасьць выкарыстоўваюць кулакі і падбухторваюць сялян супроць калгасаў.

Ячэйка КП(б)Б, якая ёсьць у Новай-Тухіні — цэнтры сельсавету—мала цікавіцца пытаньнямі калектывізацыі і не дае рашучага адпору кулацкім выступленьням.

Старшыня гэтага сельсавету тав. **Тарасенка,** замест растлумачальнай работы, запалохвае сялянства і, такім чынам, адштурхвае яго ад калектывізацыі. Так, напрыклад, калі весткі аб калектывізацыі дайшлі і да Нова - Тухінскага сельсавету, то тав. Тарасенка на агульным сходзе сялян замест растлумачэньня ролі і значэньня калгаснага руху, пачаў займацца дэмагогіяй і запалохваць сялян:

— Маўчы, а то запратаколю,—так заяўляе Тарасенка селяніну, калі той выступае на сходзе і прабуе не згадзіцца з тымі ці іншымі палажэньнямі старшыні сельсавету.

Старшыня Дубровенскага раённага крэдытнага т-ва тав. **Гарадзецкі** вырашае справу яшчэ мудрэй. Ён, адкрываючы сход, на якім ставіцца пытаньне аб калектывізацыі, папераджае сялян, каб яны не выступалі супроць калектывізацыі. А само пытаньне аб заснаваньні калгасаў вырашаецца зусім проста:

— Хто супроць савецкае ўлады, падымеце рукі, — заяўляе Гарадзецкі селянам.

Раз ніхто не галасуе супроць, значыць, пытаньне аб калектывізацыі, на яго думку, вырашана станоўча.

Такімі-ж дэмагагічнымі прыёмамі карыстаецца пры галасаваньні тае ці іншае прапановы і Тарасенка (старшыня Нова-Тухінскага сельсавету). Ён склаў пратакол на сакратара аднаго сходу, які адмовіўся запісаць у пратакол пастанову, за якую галасаваў толькі адзін Тарасенка. Гэты-ж самы Тарасенка адмовіўся прыняць у калгас жонку аднаго селяніна толькі таму, што той не зарэгістраваўся з ёю ў загсе, а жыў фактычным шлюбам.

Усе гэтыя факты сьведчаць нам аб тым, што ў Нова - Тухінскім сельсавеце скажаецца клясавая лінія партыі. Працаўнікі сельсавету не разумеюць ролі і значэньня калектывізацыі, якая павінна праводзіцца не ў прымусовым, а ў добраахвотным парадку. З гэтымі ненармальнымі зьявішчамі трэба весьці самую рашучую барацьбу. Трэба зараз-жа перавыбраць Нова - Тухінскі сельсавет, які ня можа стаяць на чале калгаснага руху на вёсцы.

ВЫПАДКОВЫ.

Усебеларуская канфэрэнцыя беднаты

Апошні дзень канфэрэнцыі

5-га сакавіка на раніцнім пасяджэньні прагаварваліся спрэчкі па дакладах **т. т. Гападзеда, Рачыцкага і Міцькова.**

Дэлегаты канфэрэнцыі праявілі надзвычайную зацікаўленасьць пытаньнямі калгаснага будаўніцтва. Дакладчыкам было падана да 200 запытаньняў, якія датычыліся арганізацыі работы ў калгасах, аплаты яе, абагуленьня маемасьці і г. д.

Спрэчкі праходзілі пры нябывалай актыўнасьці батракоў і беднякоў.

У спрэчках запісалася каля 200 чалавек, выказалася 120. Выступаўшыя адзначалі вялікае імкненьне батрацка-бядняцкіх мас да перабудовы свайго жыцьця, да калектыўных гаспадарак. Кожны дэлегат лічыў сваім абавязкам падзякаваць камуністычную партыю за рашучае правядзеньне калектывізацыі, за клопаты аб паленшаньні жыцьця бадняцка-серадняцкіх мас.

Ва ўсіх выступленьнях прасочвалася клясавая нянавісьць батрацтва і бядняцтва да свайго вскавечнага ворага—кулацтва.

***

З дакладам аб усебеларускай сельска-гаспадарчай прамысловай выстаўцы выступіў дырэктар выстаўкі **т. Дубіна,** які спыніўся на палітычным і гаспадарчым значэньні выстаўкі і ахарактарызаваў асобныя аддзелы і павільёны выстаўкі.

Канфэрэнцыя ў рэзалюцыі па дакладзе т. Дубіны поўнасьцю ўхваліла **мерапрыемствы партыі і савецкае ўлады па арганізацыі выстаўкі, якая павінны дапамагчы сацыялістычнаму будаўніцтву.**

Канфэрэнцыя прызнала падрыхтоўку да выстаўкі **баявой работай,** якая патрабуе ўвагі і ўдзелу ўсіх рабочых і батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі.

Канфэрэнцыя прызнала неабходным **пры батрацка-бядняцкіх групах арганізаваць ударныя брыгады для садзейнічаньня папулярызацыі выстаўкі сярод шырокіх мас сялянства.**

Пры арганізацыі экскурсій на выстаўку павінна быць забясьпечана **максымальнае прадстаўніцтва беднякоў, батракоў і калгаснікаў.**

***

На вячэрнім пасяджэньні 5-га сакавіка з заключным словам выступіў старшыня СНК **т. Гападзед,** які надрабязна адказаў на ўсе пытаньні дэлегатаў.

Канфэрэнцыя пастанавіла паслаць прывітаньне т. В. М. Молатаву

Прынята адзнака канфэрэнцыі да ўсіх беднякоў, батракоў, сераднякоў і калгаснікаў БССР.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі па дакладах з заключным словам, прысьвечаным вынікам канфэрэнцыі, выступіў сакратар ЦК КП(б)Б т. **Гэй.** Тав. Гэй адзначыў, што канфэрэнцыя павінна стварыць пералом у рабоце з беднатой, павінна дапамагчы далейшаму калгаснаму будаўніцтву.

***

Газэта «Зьвязда» выпусьціла спэцыяльна для канфэрэнцыі нумар, прысьвечаны калгаснаму будаўніцтву, у якім зьмешчаны статут с.-г. арцелі і парадак веснавых с.-г. работ. Нумар разданы дэлегатам.

Прывітаньне т. Молатаву

Аднаму з лепшых барацьбітоў Ленінскае гвардыі, вернаму і пасьлядоўнаму ленінцу—тав. **Молатаву** першая Ўсебеларуская Канфэрэнцыя бядняцка - батрацкіх груп шле шчырае прывітаньне.

Батрацтва і бядняцка-серадняцкія масы вёскі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, разгарнулі грандыёзную работу па сацыялістычнай перабудове вёскі. Пад кіраўніцтвам партыі і ленінскі ЦК, што батрацтва і беднота ў сацыялістычнай перабудове вёскі і клясавай барацьбе будзе вернай і надзейнай апорай партыі.

Няхай жыве ўсесаюзная камуністычная партыя (бальшавікоў)!

Няхай жыве ЦК УсеКП(б)Б!

С. Г.

Перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых

У атмасфэры поўнага роўнадушша

Перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых маюць выключнае, па сваёй важнасьці, палітычнае значэньне. У выніку гэтых перавыбараў павінен быць зроблен рашучы паварот прафсаюзных ячэек **«тварам да вытворчасьці».** Перавыбары заўкомаў саюзу мэталістых, якія адбываюцца на аснове новых форм і мэтадаў прафработы (сацспаборніцтва, узаемная праверка заводаў, самаправерка добраахвотнікамі, дапамога іншых прафсаюзаў і прадпрыемстваў і г. д.), **павінны служыць прыкладам для перавыбараў фабзаўкомаў усіх іншых прадпрыемстваў.**

Таму пралетарская грамадзкасьць павінна зьвярнуць на перавыбары заўкомаў мэталістых **самую сур'ёзную ўвагу.** Таксама вялікую ўвагу павінны зьвярнуць на гэтае пытаньне **ўсе прафсаюзы.**

Як-жа ідзе падрыхтоўка да перавыбараў?

Паводле пляну, які зацьверджан прэзыдыумам Бел. камітэту саюзу мэталістых **26 лютага,** падрыхтоўка да справаздачна - перавыбарчай кампаніі заўкомаў павінна была пачацца **25 лютага.** Можна было дараваць гэту няўвязку ў датах, калі-б падрыхтоўка началася, ну, скажам, чысла 27-28. На жаль, нашы прафработнікі **топчуцца на месцы і па гэты дзень**

З 25-га лютага па 10 сакавіка на прадпрыемствах саюзу мэталістых павінны былі адбыцца зьмена - цэхавыя сходы па пытаньні аб новай сыстэме перавыбараў. Гэтыя-ж сходы павінны былі зацьвердзіць добраахвотнікаў для праверкі работы заўкомаў і прафцэхбюро. **Але да гэтага часу работа не пачата,** за выключэньнем таго, што ў акругі 2-3 сакавіка выехалі члены прэзыдыуму Белкамітэту саюзу мэталістых і некалькі работнікаў іншых саюзаў. Пакуль што з акругі ніякіх вестак няма і даць ацэнку іх рабоце яшчэ нельга. Але тое, што робіцца ў Менску, **прымушае біць трывогу.**

За ўвесь час толькі на заводзе «Энергія» 4-5 сакавіка адбыліся 2 цэхавыя сходы. Што датычыць «Камунара» і «Эльводу», дык там яшчэ нічога **не зроблена.** Але і гэтыя сходы на «Энергіі» ня прынесьлі карысьці. Напершае, яны адбыліся ў часе абедзеннага перапынку, падрыўна на месцым сходзе былі заслуханы **адразу па 3 інфармацыі:** аб рэарганізацыі прафапарату, аб добраахвотніцтве і аб новых формах перавыбараў заўкомаў (гэта ўсё **за адну гадзіну).** Можна сказаць з упэўненасьцю, што **ні адно з гэтых пытаньняў ня ўцямлена рабочымі больш-менш грунтоўна.**

На сёньнешні дзень ні адзін заўком па Менску ня мае **канкрэтнага пляну** кампаніі ў маштабе свайго заводу. Паколькі няма пляну, зразумела, на парадак дня не пастаўлены пытаньні сацспаборніцтва, узаемнай праверкі, самаправеркі і г. д.

Ні ЦСПСБ, ні ЦП прафсаюзаў ня цікавяцца перавыбарамі заўкомаў мэталістых. Прымацаваныя ў пачатку да заводаў работнікі ЦСПСБ т. т. **Калодка і Мірынгоф** зараз вызвалены ад гэтага абавязку прэзыдыумам ЦСПСБ, які вылучыў іншых таварышоў, у прыватнасьці, старшыню ЦП саюзу саўгандальслужачых — тав. **Плятнёва,** які катэгарычна заявіў: «Я не пайду, дасьлязаўтра выязджаю». Старшыня ЦП саюзу швейнікаў тав. **Шпэктраў** 5 першых дзён сакавіка хварэў, сёньня ён адыжджае ў Віцебск па справах свайго саюзу. Прымацаваны старшыня ЦП саюзу трансраб тав. **Касьцевіч** 4 сакавіка заглянуў на «Камунар» і зьявіўся першым з прымацаваных, якія наведалі завод. З прычыны таго, што адпаму — сумна, тав. Касьцевіч прапанаваў заўкому склікаць усіх прымацаваных для прапрацоўкі пляну кампаніі. ЦП саюзу камунальнікаў, якое павінна было даць свайго адказнага работніка, **нічога аб гэтым ня ведае** (так заявіў намесьнік старшыні тав. **Мароз**). Заўком гарбарні «Бальшавік», які павінен быў выдзеліць у дапамогу заводу «Энергія» (**свайму суседу**) члена заўкому, **таксама нічога аб гэтым ня ведае** (паводле слоў намесьніка старшыні заўкому тав. **Левіна**). Заўкому павінна было аб гэтым паведаміць ЦП саюзу гарбароў. Але ў ЦП саюзу загадчык арганізацыйна - інструктарскім сэктарам тав. **Рохкін** цацісае плячыма і кажа, што ніякіх дырэктыў наконт гэтага ён не атрымаў. Фабком швейнай фабрыкі «Кастрычнік» таксама ад свайго ЦП ніякіх дырэктыў не атрымаў. Прэзыдыум ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў яшчэ 26 лютага вылучыў члена заўкому заводу «Дрэваапрацоўшчык» рабочага ад гарштату тав. **Мурохи Г. Але да 5-га сакавіка ніхто нічога Мурохи не сказаў,** ня гледзячы на тое, што на пасяджэньні прэзыдыуму ЦП прысутнічалі **старшыня заўкому заводу тав. Герман, старшыня культкамісіі заводу тав. Карасік** і яшчэ 15 рабочых заводу.

Такім чынам, з **9-10 прымацаваных да саюзу мэталістых прафработнікаў ні адзін не пачаў работы** і ў выніку справаздачна - перавыбарчая кампанія заўкому саюзу мэталістых у Менску, **якая павінна быць узорнай** (паколькі мы ў Менску маем увесь кіруючы штаб прафсаюзаў і ўсяго толькі 3 прадпрыемствы), праходзіць **вельмі і вельмі кепска**

Гэта гаворыць аб тым, што менскія прафработнікі не ўсьвядомілі ўсяго палітычнага значэньня перавыбараў заўкому саюзу мэталістых.

ПРАЎДЗІН.

Рэмонтная майстэрня с.-г. машын у калгасе.



Выраб машыны для разлёпу капны (Менск, завод «Камунар»)

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАЛЯВЫХ РАБОТ

Індывідуальны сэктар выпаў з-пад увагі зямельных органаў

Пасеўная плошча, аб'яднаная ў калгасах па БССР, складае 65 проц. 35 проц. пасеўнае плошчы прыпадае такім чынам на індывідуальны сэктар. Адсюль перад зямельнымі органамі БССР вынікае сур'ёзная задача—побач з абслугоўваньнем сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі, падрыхтаваць да сэўбы і правесьці яе і ў індывідуальным сэктары.

Шпаркі тэмп суцэльнае калектывізацыі выклікае шалёнае супраціўленьне кулацтва, якое вядзе актыўную агітацыю сярод беднякоў і сераднякоў, якія яшчэ не аб'ядналіся ў калгасы, за зрыў сэўбы, за памяншэньне яравога кліну. Гэтая агітацыя мы павінны процістаяць бальшавіцкую масавую работу сярод тае часткі бядняцтва і серадняцтва, якая яшчэ не ахоплена калектывізацыяй.

